проза

Алесь Рыбак



...жывы, здаровы, цэлы ўвесь,
а во сядзі тут, пакуль не сканаеш ад
холаду, голаду, а больш ад сваёй немачы...

# У яме

***Апавяданьне***

Тая другая пасьляваенная зіма ў Галабродах пачалася нязвыкла позна, але са зьменай квадры зьмяніўся і вецер, і за адну ноч скавала льдом Шушанку і азярыны пры ёй, насыпала як не па калені сухога пульхнага сьнегу.

Буфет Юзік канчаў акурат перад Калядамі. Апошнія дні вышчарыўся пякучы, пэўна, за дваццаць было, мароз, таму давялося са стадолы перабрацца ў хату і ўжо ў цяпле дагаблёўваць апошнія дошчачкі.

Верка трохі крывілася, бурчала, сёньня ёй нешта нядобрылася, а тут раптам гэткі вэрхал, гэтулькі стукату-грукату, стружак і пылу, што хоць бяжы куды. Але куды пабяжыш, куды падзенешся? Можна б зачыніцца ў зале, што глядзелася двума вокнамі на вуліцу. Там чыста, нават засьцелены новыя, толькі ўчора скончыла ткаць на кроснах, ходнікі, але ж та-

мака зараз хоць ваўкоў ганяй. Грубку паліць яшчэ рана, наперадзе доўгі вечар і ноч, і пад раніцу руку з-пад коўдры і так ня высунеш.

— Канца ня будзе гэтай тваёй рабоце, — Верка, паслаўшы кажух, прылегла на шлабан, пагладзіла добра-ткі ўжо разбухлы жывот. — Сечкі, во, толькі на раз засталося, ды і жыта астатняе дамалаціць трэ, а ты ўсё з гэблікамі сваімі...

Юзік не пярэчыў, завіхаўся яшчэ спарней, ведаў: Верку ня трэба хваляваць, яна адобрыць, пахваліць, як толькі ўбачыць, які файны буфет атрымаецца. Ідзі купі дзе такі! Ды і за якія шышы?

— Вадзім са школы прыйдзе, разам і нарэжам. І жыта тога на дзьве гадзіны цапамі, — Юзік быў у добрым настроі і не зьвяртаў увагі на зьвягі жонкі, аберагаў яе цяжарнасьць.

Пасьля таго, як невядома ад якой хваробы згарэла цельцам і меней чым за суткі, не пасьпелі апамятацца і ўрача прывезьці са Стаўбуноў, памерла іх меншанькая, яшчэ і месяца не было, дачушка (Божа-Божа, што яны тады перажылі, як убівалася Верка, колькі сама праляжала хворая!), ён цяпер, калі жонка ўзялася другім дзіцем, стараўся ўсё ўзваліць на сябе, толькі б ёй было добра, толькі б не расьцьвеліць яе нервы чым лішнім, непатрэбным.

У хату, не пастукаўшыся гэтым разам, зайшла, напусьціўшы клубы марознай пары, Клаўдзя, іхняя паштарка. Верка ўсхапілася з шлабана, чамусьці занепакоілася. Пісьма ні ад кога яна не чакала. Хіба мо ад брата Славіка з тога яго Сувораўскага вучылішча? Але ж тыдзень назад яны атрымалі ад яго канверт. А мо?.. Крый Божа зноўку якая нядоімка!..

Клаўдзя, бачачы Верчыную разгубленасьць, хуценька выняла з брызентавай, пацертай торбы складзены салдацкім трохкутнікам канверцік-пісьмо, глянула на зваротны адрас, аддаючы, супакоіла:

— Не трасіся, Наста вестку шле. Мо засумавала ў тэй лясной глушэчы?

Верка разгарнула, расправіла паперчыну, прачытала і перадала Юзіку. Пісала ня Наста, а Янак, ейны муж. Юзік ледзьве разьбіраў Янкаў почырк, але ўсё ж зразумеў: Наста хварэе запаленьнем лёгкіх і ніяк ня можа вылузацца з немачы. І таму просьба і да Юзіка, і да Веркі пад'ехаць да іх у Барсукі і прывезьці, калі не прадалі яшчэ ўвесь, троху мёду на лякарства.

Яны тады наскрэблі з дна бітона як ня поўную алюмініевую місачку, добра ўпакавалі, Верка сьпякла яшчэ калач, і назаўтра Юзік запрог Малыша, сабраўся ў няблізкую адсюль залесную вёску. Верка заікнулася, каб мо і ёй ехаць разам, пабачыць Насту, Янака, ды і так хацелася адвінуцца, бо абрыдзела з восені сядзець дома. Юзік рашуча адгаварыў яе.

Дарога ішла лесам, але была працёртая, і ня толькі саньмі, але і коламі машынаў, бо ў тым баку, далей за Барсукамі, месьцілася нейкая сакрэтная вайсковая часьць. Ехалася лёгка, добра, пасьля працяглай адлігі ноччу, відаць, падсыпала сьвежага сьняжку, і сані сьлізгацелі як па масьле. Малыша таксама ня трэба было падганяць — пасьля лета

і восені, калі не вылазіў ні з хамута, ні з аглобляў, зараз, без цяжкой працы, ён выгладзіўся, акрэп і бег з ахвотай сам. Абапал, па адзін і другі бок, стаялі высокія гонкія сосны, здаецца, густа памазаныя воскам ці мёдам — гэтак хораша глядзеліся. На некаторыя, каб акінуць вокам вершаліну, даводзілася задзіраць угору галаву, так, што ажно шапка зьлятала. Юзік недзе чуў, што гэта карабельныя сосны, і на іх наклала лапу дзяржава, ніякі лясьнік ня меў права сьпілаваць хоць адну.

Мо за вярсты тры ад Барсукоў Юзіку шыхнула ў галаў думка спрасьціць шлях, і ён зьвярнуў управа на нешырокую дарожку, якая, ведаў з ранейшых сумесных з Янакам паездак, выводзіць да саменькай вёскі. Тым больш што і на ёй быў адбітак саннага сьледу, праўда, ня сьвежы, але яшчэ трохі прыкметны. Тут лес быў гусьцейшы, карабельных соснаў страчалася ўжо меней, затое раскашавалі таўсматыя разлапістыя елкі. Стала цямней, а як зусім незаўважна згубіўся ранейшы сьлед палазоў, Юзік ужо і пашкадаваў, што выправіўся сюдою. "Хоць бы не зблудзіць, чаго добрага, — мільгнула думка. — Але ж не вяртацца назад. Мо скора і гароды".

Аднак ён ехаў з гадзіну, а запаветнага прагалу з гушчэчы, які б сьведчыў, што недзе побліз чалавечае жытло, усё не было і не было. Малыш і той выяўляў трывогу, сьцішыў як мага хаду, раз-пораз варочаў галаву, аглядваўся на гаспадара, бы пытаючыся ці дакараючы, куды ён кіруе.

Дарожка тым часам звузілася так, што ўжо сані ледзьве прасоўваліся між суцэльнай сьцяны ляшчэўніку, нейкага іншага крывабокага, пашкуматанага зімнімі сьцюжамі, хмызу. Разьвярнуцца, каб і хацеў, і паехаць назад ужо не было ніякай магчымасьці. Пачаў спакваля падкрадвацца страх. Юзік зусім спыніўся, надумаў сам пешкі прайсьці ўперад, паглядзець, што там і як. Здаля ўбачыў нейкую прасьветліну і зарадаваўся, вырашыўшы, што гэта і ёсьць ваколіца Барсукоў. Ня стаў бавіць часу, вярнуўся да каня, узяў у рукі лейцы. Не праехаў і колькі метраў, як дзесь недалёка — а мо так у зацішаным лесе падалося — грымнуў стрэл, за ім усьлед другі. І адразу ж, спачатку бы нясьмела, пасьля ўсё мацней і мацней пачаў шырыцца, нарастаць гул. Ён набліжаўся да іх з маланкавай хуткасьцю, стаў неўзабаве чуцен тупат многіх ног, трэск гальля, дрэваў, гарачае хрыпатае дыханьне. Малыш скалануўся ўсім целам, пасьля ўзьвіўся на дыбкі, хацеў кінуцца куды збоч, але, ня бачачы выйсьця, ашалела рвануў наперад. Юзік — во разява! — упусьціў, хапаючыся за білы, лейцы, і конь цяпер стаў непадуладны яму. На прагале Малыш рэзка рвануў улева, раптоўна асадзіў галоп, і Юзік, падаючы з саней потырч у сьнег, затым скочваючыся ў нейкае прадоньне, краем вока зьмеціў агромністага сахатага, за ім цэлы статак большых і меньшых суродзічаў, якія, усё падмінаючы ў сябе на шляху, як не пад самым носам у іх перабеглі дарожку. Гул і тупат ласёў аддаляўся, а ён усё ляжаў, прыслухоўваючыся да сябе, ці цэлы, ці не зламаў руку альбо нагу, а то й хрыбетнік. Вочы, вушы, нос былі забітыя сьнегам уперамешку з чвірам, нават набралася нямала ў рот, і ён, перш чым варушыцца, нешта іншае рабіць, пачаў сплёўваць, ачышчаць глотку.

Дно, куды яго кінула, было глыбознае, Юзік ледзьве не заплакаў, калі працёр збольшага вочы і глянуў уверх. Дацягнуцца рукою да краю, з якога боку ні вазьмі, і думаць не даводзілася. “Скуль жа такая яма? — пачала ўжо браць паніка. — Няйнакш, варонка ад бомбы. А мо хто на ласёў выкапаў?” Трохі суцешыўся, калі адчуў, што ўсё цела слухаецца, нічога, здэцца, не зламаў і ня вывіхнуў. Так-сяк стаў на ногі, знайшоў шапку, атрэпаў ад сьнегу і пяску, адзеў на галаву. Трэба было думаць, як выбавіцца адсюль. Браў непакой і за каня: дзе ён, што з ім. Хоць бы таксама куды не ўваліўся. Няголасна паклікаў:

— Косю! Ко-о-о-сю!

Голас ягоны аддаўся наверсе глухім рэхам, але, колькі ні ўслухоўваўся, Малыша і почуту не было чуваць. Наскамі валёнак, адзетых у буцы, Юзік пачаў калупаць на дне ямы, спадзеючыся адшукаць якія кол ці рагаціну, каб можна было імі зачапіцца за край, мо і падцягнуцца. Ён недзе ўсьведамляў, што гэта задума марная, пустая, але ж не хаваць сябе пожыву, нешта трэба рабіць. “Тапелец і за саломінку хапаецца”, — успомнілася людская мудрасьць. Выграб некалькі сукоў, аднак яны аказаліся малыя і амаль струхлелыя. У адчаі ажно скрыгатнуў зубамі.

— Косю, ко-о-осю! — яшчэ раз гукнуў як мага грамчэй. — Малы-ыш!

Зноў нідзе зьверху ні шоргату, ні гуку, бы ўсё вымерла наўкола.

Клікаць на помач людзей ня мела, відаць, аніякага сэнсу. Хто тут у зімовым лесе, а яшчэ ў гэтай яме, пачуе? Які дурань, апроч цябе, паедзе ці пойдзе па тваіх сьлядах, якія прывялі невядома куды і ў якую глушэчу? Хіба мо хто з паляўнічых альбо з банды? Нехта ж, во, стрэліў два разы... Мо той, хто страляў, зьмеціць каня без ездака і пачне шукаць гаспадара?

На гэта таксама была марная надзея, але Юзік набраў поўныя грудзі паветра і, наколькі хапіла духу, зноў парушыў спакой лесу:

— Гэ-гэ-э-эй, лю-ю-юдзі!

Натапырыў вушы, і зноў нічога, апроч хіба ветру ў вершалінах недалёкіх адсюль дрэваў. Больш недарэчнага становішча нельга было і прыдумаць. Жывы, здаровы, цэлы ўвесь, а во сядзі тут, пакуль не сканаеш ад холаду, голаду, а больш ад сваёй немачы.

Млосьць падкаціла да грудзей, а пасьля ахапіла ўсё цела. Ён, падабраўшы пад сябе крысо кажуха, сеў на горбік сьнегу на дне, пачаў праваьлвацца ў забыцьцё. Ад нейкага ўнутранага штуршка прахапіўся быў, хацеў падняцца, але ногі чамусьці ня слухаліся, і ён застаўся сядзець, як і сядзеў. Не заўважыў, як самі сабой заплюшчыліся вочы.

Мроілася, што ён дома, Верка пячэ на пліце бліны, адтуль пахне смажаным здорам. Але яму хочацца яшчэ хоць трошкі паваляцца ў ложку, падрамаць, як некалі ў дзяцінстве, калі жывыя былі маці і бацька і было каму яго, малога, пашкадаваць, паклапаціцца аб ім. Верка таксама чамусьці нічога ня кажа, не катурхае, усё кідае і кідае гарачыя пульхныя блінцы на разасланы на стале ручнік, на другой патэльні мяшае скваркі са здорам, і яны сквірчаць, пыхкаюць тлушчам, выклікаюць шалёны

апетыт. Ён успамінае, што сёньня ж нядзеля, сьвяты дзень, нічога грубага рабіць ня можна, мо таму жонка і не трывожыць. “А як жа скаціна? — скаланае думка. — Ужо даўно пара карміць”. Ён падхопліваецца, на хуткую руку апранаецца, выходзіць на двор.

Падае сьняжок, пульхнымі бязважкімі пушынкамі садзіцца на голыя рукі, на шчокі. Ціша навокал. Але вось з хлява, відаць, пачуўшы гаспадара, падае голас Малыш. Юзік дакарае сябе, што так доўга, як падла тая, вылежваўся ў пасьцелі, а конь, карова, сьвінчо за ноч згаладнелі і пра іх ніхто ня дбае. Малышу дык наогул няўцерп, ён зноў сьведчыць пра сябе нецярплівым іржаньнем, але гэты раз надта ж гучна, як не над саменькім вухам. Во, нават капытом зямлю грабе...

Нешта звалілася яму на каўнер, пасьля зашабуршэла па кажусе ззаду. Як уколаты голкай, Юзік прахапіўся, глянуў уверх. Працёр астылымі пальцамі вочы і ажно не паверыў сабе: Малыш, яго Малыш стаяў паўз край ямы, глядзеў на свайго гаспадара ні то са зьдзіўленьнем, ні то з дакорам — чаго, маўляў, там вылежваешся, ад каго хаваешся, усё ж ужо ціха, тыя рагатыя страшыдлы некуды далёка паляцелі, нішто нам болей не пагражае. Трэба ж і ў дарогу рупіцца, зімовы дзень хутка сканае...

Юзік, ашалелы ад радасьці, падхапіўся, працягнуў каню руку, але, ацаніўшы сваё становішча, зноў асеў на сьнежны горбік. Чым, чым Малыш яму паможа? Стане задам, укленчыць і спусьціць уніз хвост, за які можна ўчапіцца? Але ж гэтак толькі ў казках бывае, у выдумках для дзятвы.

Ён зноў, каторы ўжо раз, абышоў наўкруг яму, паспрабаваў пры дапамозе сучка пакалупаць сьценку. Сьнегу па баках было мала, і Юзік, дабраўшыся да сыпкай зямлі, выграб нешырокую, толькі як нагу паставіць, пячурку. Тое ж зрабіў для другой нагі. Прабіў невялікую выемку і на вышыні галавы, каб трымацца рукамі. Стаўшы ў тыя пячуркі, можна будзе калупаць новыя, ужо вышэй. Разважыў, што калі гэтая задумка ўдасца, то і да верху дабярэцца.

Абнадзеены, ён прыладзіў сук за рэмень, якім апярэзваўся паверх кажуха, тым самым выслабаніў сабе рукі і ступіў у падрыхтаваныя дзюркі. Аднак не пасьпеў і апамятацца, як ужо ляжаў дагары нагамі на дне ямы. Смылела ў баку, ды і ўваччу замітусіліся чорныя мушкі. Адольваючы немач, усё ж мусіў падняцца, паварушыў плячамі, зноў падняў і атрапаў шапку, глыбей насунуў на зьлямчаныя валасы. У баку па-ранейшаму ныла. Юзік зіркнуў на рэмень і адразу здагадаўся, ад чаго боль — падаючы потырч, ён зламаў на сабе сук, мо дзе і кажух прапароў, параніў цела. Але ж што з пячуркамі? Чаму ён грымнуўся?

Ён падышоў да сьцяны ямы і ўсё зразумеў: дзюркі як лёгка калупаліся, гэтак жа лёгка, варта было толькі стаць на іх, і рассыпаліся. Спадзеву, што гэткім чынам выберацца, больш не заставалася.

Нямала ўжо абясьсілены, ён зноў прысеў на дол. Дзякаваць Богу,

што яшчэ конь стаяў на месцы, раз-пораз нецярпліва дыгаў нагамі, ад чаго ўніз ляцелі камякі сьнегу.

Тым часам паветра ўвачавідкі гусьцела, зьнекуль напаўзьлі, чапляючыся амаль за самыя макаўкі ялін, цёмныя калматыя хмары. Пачаў, спачатку квола, нясьмела, пасьля ўсё гусьцей і жвавей, падаць сьнег. “Гэтага толькі не ставала, — не на жарты ўстрывожыўся Юзік. — Так доўга і конь ня вытрывае, зьбяжыць”.

Ён зноў падышоў да краю і, гледзячы зьнізу ўверх, паклікаў Малыша. Той, бы пацьвярджаючы, што чуе, затрос галавою, нават крануў сані ўперад.

І тут Юзіку трапілі на вочы лейцы, што целяпаліся паўз край ямы, тыя лейцы, якія ён так неасьцярожліва ўпусьціў, за што, во, і паплаціўся. Адразу шыхнула ў голаў думка неяк вярнуць іх назад, у свае рукі. Астатняе ўжо як пашэнціць: вытрымае сырамяць, не парвецца, не падвядзе, устаіць на месцы конь, — лічы, ён ураваны. Не — то што ж, такая яму плата за сваю легкадумнасьць.

Але трэба спачатку займець тыя лейцы. А як, як? Была б хоць палка, хоць дубец больш-менш даўгаваты — умомант падгроб бы лейчыну, спусьціў уніз, калі толькі не заблыталася між ног і не прыціснутая палазамі. Аднак нічога пад рукой не было і іншага выйсьця ня бачылася, і тады рашыўся ён на апошні крок: упрасіцьулагодзіць Малыша, каб прайшоўся наўкруг ямы, мо лейцы аслабяцца і як-небудзь самі спадуць уніз, так, каб льга было ўхапіцца за іх абеуч і ўжо больш не выпускаць.

Наваждаўся ён тады, намучыў, і вельмі нават, Малыша, але нарэшце-ткі атрымалася — не пасьпела яшчэ прыцьмець, як ён быў на волі. Дзякаваць Богу, было ўсё і на возе цэлае. Аддыхаўся і, пакуль канчаткова не замяло ранейшага сьледу, рушыў назад. Хацеў быў ужо ня ехаць да сястры, да Янака, але ўспомніў, як патрэбен ім мёд, скіраваў на знаёмую дарогу, дзе, ведаў, болей не заблудзіцца...

---

*«Дзеяслоўцы» віншуюць шаноўнага Алеся Пятровіча Рыбака з 70-годдзем і жадаюць яму моцнага здароўя, посьпехаў — і новых значных твораў.*